## Культурна-масавыя мерапрыемствы, праведзеныя бібліятэкамі ДУК “Лунінецкая РЦБС” у жніўні

**7 жніўня. ЦБ.** Адбыўся дзень памяці Аляксандра Блока “Сотри случайные черты – и ты увидишь мир прекрасен…», прысвечаны 100-годдзю з дня смерці рускага паэта. Імя вялікага паэта, класіка рускай літаратуры звязана з Палессем. Ён не раз наведваў Лунінеччыну. Пачалося мерапрыемства з паведамлення аб жыцці і творчасці А.Блока. Удзельнікі народнай літаратурна-паэтычнай студыі “Литературная провинция” чыталі вершы паэта і вершы ўласнага складання, яму прысвечаныя, а таксама вершы аб прыродзе, нашым горадзе, расказвалі малавядомыя факты жыцця і творчасці пісьменніка.
На мерапрыемстве прысутнічала пісьменніца Піншчыны Ніна Енбулаева. Яна расказала пра наведванне літаратурнага музея Аляксандра Блока ў в.Лапацін Пінскага раёна і прачытала уласны верш, прысвечаны паэту.
**9 жніўня. ЦБ.** Штогод ў жніўні ў Лунінцы праходзяць Дні памяці Аляксандра Блока і даследчыка палескага перыяду яго жыцця, пісьменніка і краязнаўца Мікалая Калінковіча. 9 жніўня супрацоўнікі прынялі ўдзел ў цырымоніі ўсладання кветак к памятніку Мікалаю Калінковічу *(Лунінецкія навіны. 2024. 16 жніўня. С.5.)*
**9 жніўня. Мікашэвіцкая г.б.** Прайшла краязнаўчая гульня-падарожжа ў гісторыю роднага края “Любі і ведай родны свой край”. У пачатку мерапрыемства дзецям расказалі аб гісторыі ўзнікнення горада і легендах, прысвечаных Мікашэвічам. Потым усе актыўна ўдзельнічалі ў літаратурна-гульнявой праграме.
**10 жніўня. Мікашэвіцкая г.б.** Супрацоўнікі бібліятэкі прынялі ўдзел у святочных мерапрыемствах, прысвечаных **Дню будаўніка** і **Дню горада** Мікашэвічы. На інтэрактыўнай бібліятэчнай пляцоўцы “Островок детства” увазе жыхароў і гасцей горада былі прадстаўлены кніжная выстаўка краязнаўчай літаратуры “З днём нараджэння, любімы горад!”, зона адпачынку з гульнямі, цікавымі заданнямі і фотазонай. Усе жадаючыя змаглі прыняць удзел у віктарыне “Горад будаўнікоў” і паўдзельнічаць у гульнявой праграме. Таксама для дзецей была арганізавана фотазона з героямі любімых кніг.

Бібліятэкі-клубы арганізоўваюць і праводзяць **святы вёсак.** Так, **7 жніўня** бібліятэкары **Кажан-Гарадокскай сельскай бібліятэкі-клуба** правялі свята вёскі “Сяло маё цудоўнае на беразе ракі” *(Лунінецкія навіны. 2024. 21 жніўня. С.8*). **10 жніўня** бібліятэкар **Бродніцкай сельскай бібліятэкі-клуба** правяла свята вёскі “Мая родная старонка”, да 420-годдзя з дня заснавання вёскі. **4 жніўня** прайшло свята ў **Люшчанскай сельскай бібліятэцы-клубе** “Сердцу милый уголок”.

У жніўні ў бібліятэках раёна працягваліся мерапрыемствы з дзецьмі.
**22 жніўня. ЦДБ.** У бібліятэцы прайшла пазнавальная гадзіна “Про безопасность”. На мерапрыемства запрасілі супрацоўніка МНС, старшага інспектара сектара прапаганды і ўзаемадзеяння з грамадскасцю Марыну Віталььеўну Качура.

У **Любанскай с.б.** прайшла гадзіна бяспекі “Мой друг – светофор”, у Сінкевіцкай с.б. адбыўся майстар-класс “Скарбонка творчых знаходак”.
**24 жніўня** ў Кажан-Гарадокскай сельскай бібліятэцы-клубе прайшла забаўляльна-гульнявая праграма “Вот и лето прошло», у Палескай с.б. – дарт-квэст “Что ты знаешь о родном крае”, у Ракітненскай с.б. - дзень гульняў і чытання “Книги – лучшие друзья”.
**25 жніўня** ў Лунінскай с.б. адбылася эрудыт-лато “Лето и книга – 2024” і інш.

У жніўні прайшлі мерапрыемствы са святарамі, прысвечаныя тром Спасам.
**16 жніўня. ЦБ**. Адбылася сустрэча выхаванцаў адзялення дзённага знаходжання для інвалідаў Лунінецкага ТЦСАН з настаяцелем Свята-Параскевінскага храма, пратаірэем Іаанам Пяртэнка.
**23 жніўня. ЦБ**. У духоўна-асветніцкім цэнтры “Истоки» прайшла праваслаўная гадзіна “Три Спаса”. На мерапрыемства запрасілі настаяцеля храма Казанскай іконы Божай Маці (в.Рэдзігерава), іерэя Аляксандра Барысава.